Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 19 (232) | Пятніца, 23 верасня 1955 года | Цана 20 кап.

## ЗА ВЫСОКУЮ АКТЫЎНАСЦЬ КОМУНІСТАЎ

У пярвічных партыйных арганізацыях універсітэта заканчваюцца справаздачы і выбары. Гэта — першы этап справаздачна-выбарчай кампаніі, якая завяршыцца агульнауніверсітэцкім партыйным сходам.

Характэрная асаблівасць справаздачна-выбарчых партыйных сходаў састаіць у тым, што яны праходзяць у абстаноўцы ўсенароднай барацьбы за выкананне гістарычных рашэнняў ліпеньскага Пленума ЦК КПСС аб далейшым развіцці соцыялістычнай прамысловасці, мерапрыемстваў партыі па крутому ўздыму ўсіх галін сельскай гаспадаркі. Гэта вызначае тую высокую патрабавальнасць, з якой комуністы ацэньваюць вынікі праведзенай работы, на аснове шырока разгорнутай крытыкі і самакрытыкі ўскрываюць недахопы, распрацоўваюць мерапрыемствы па паляпшэнню дзейнасці партыйных арганізацый.

У цэнтры ўвагі справаздачна-выбарчых сходаў стаяць пытанні паляпшэння вучэбна-педагагічнага працэсу, больш цеснай сувязі навукі з вытворчасцю, паляпшэння выхаваўчай работы з выкладчыцкім саставам і студэнтамі. Так, на высокім узроўні прайшоў партыйны сход у партарганізацыі хімічнага факультэта. Комуністы ўказвалі, што на факультэце больш цесна пачалі ўвязвацца пытанні навуковай работы з надзённымі задачамі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, палепшылася вучэбна-выхаваўчая і масава-палітычная работа. Было падвергнута крытыцы партыйнае бюро за недастатковы кантроль над падрыхтоўкай навуковых кадраў, асабліва аспірантаў.

Інакш прайшоў справаздачна-выбарчы сход у партыйнай арганізацыі філалагічнага факультэта. Замест таго, каб сур'ёзна, па-дзелавому абмеркаваць дзейнасць партыйнага бюро, дакладчык т. Булацкі, выступаючыя ў спрэчках комуністы падыйшлі да гэтай справы павярхоўна, не падверглі партыйнае бюро сур'ёзнай крытыцы за слабы кантроль над вучэбна-выхаваўчым працэсам. Трэба сказаць, што дэканат філалагічнага факультэта рабіў далёка не ўсё для паляпшэння дысцыпліны студэнтаў, для наладжвання масава-палітычнай работы сярод іх. Трэба было чакаць, што аб гэтых недахопах на партыйным сходзе будзе ісці сур'ёзная размова. На жаль, гэтага не адбылося; аб рабоце комуністаў дэканата было прыведзена толькі некалькі дробных фактаў.

Амаль нічога не гаварылася аб рабоце членаў бюро. Між тым, адказная за работу комсамольскага і профсаюзнага бюро факультэта т. Мартынюк за справаздачны перыяд ні разу не прысутнічала на пасяджэннях комсамольскага і профсаюзнага бюро, ні разу не пацікавілася ў тт. Ткачука і Абушэнкі аб іх рабоце і аб тым, якая дапамога ім патрэбна. Многа недахопаў было і ў дзейнасці члена бюро т. Науменкі, які адказваў за палітыка-выхаваўчую работу. Гэта-ж факт, што ў перыяд выбарчай кампаніі ў Советы дэпутатаў працоўных агітатары факультэта працавалі дрэнна.

Партыйныя сходы—школа выхавання комуністаў. Тым больш важнае значэнне павінны набыць справаздачна-выбарчыя сходы. Вядома, што боездольнасць любой пярвічнай партыйнай арганізацыі залежыць ад актыўнасці шырокіх мас комуністаў, ад іх дзейснага ўдзелу ў вырашэнні ўсіх пытанняў партыйнай, гаспадарчай і дзяржаўнай работы. Увага справаздачна-выбарчых сходаў павінна быць прыкавана да таго, як партыйныя арганізацыі выхоўваюць комуністаў, праяўляюць клопаты аб іх марксісцка-ленінскай загартоўцы, павышаюць іх авангардную ролю. Трэба дабіцца, каб ва ўсіх пярвічных арганізацыях унутрыпартыйнае жыццё біла крыніцай, каб усе комуністы былі актыўнымі барацьбітамі за справу партыі.

Справаздачна-выбарчыя сходы павінны праходзіць на высокім узроўні, па-дзелавому, у абстаноўцы шырока разгорнутай крытыкі і самакрытыкі, пры строгім захаванні прынцыпаў унутрыпартыйнай дэмакратыі. Высокая актыўнасць комуністаў на сходах магчыма толькі пры ўмове, калі яны ў поўнай меры выкарыстаюць прадстаўленыя ім Статутам КПСС правы смелай і бязлітаснай крытыкі недахопаў, вылучэння і адводу кандыдатур пры выбарах кіруючых партыйных органаў.

У хуткім часе ва універсітэце адбудзецца справаздачна-выбарчы партыйны сход. Гэты сход павінен з'явіцца важнай падзеяй ў жыцці комуністаў нашага калектыву. Трэба дабіцца таго, каб яго падрыхтоўка і правядзенне прайшлі на высокім узроўні, каб у склад новага партыйнага камітэта былі выбраны людзі, здольныя кіраваць шматгранным жыццём нашай партыйнай арганізацыі.

## НА КАФЕДРЫ „ФІЗІЯЛОГІЯ РАСЛІН"

Адбылося пасяджэнне кафедры «Фізіялогія раслін». Загадчык кафедры, прафесар Т. Н. Годнеў расказаў аб задачах, якія стаяць перад кафедрай у новым навучальным годзе.

На пасяджэнні быў абмеркаван план работы, распрацавана тэматыка работы студэнцкага навуковага гуртка «Фізіялогія раслін», які працуе пры кафедры.

У гэтым годзе кафедрай будзе праведзен вялікі спецпрактыкум па анатоміі і фізіялогіі раслін, для якога на IV курсе біёлага-глебавага факультэта адведзена 300 гадзін. Практыкум будзе весці дацэнт С. В. Калішэвіч.

## Навінкі літаратуры

З кожным днём папаўняецца кніжны фонд бібліятэкі універсітэта, расце лік ее чытачоў. Толькі за 15 дзён бягучага месяца колькасць літаратуры бібліятэкі ўзрасла амаль што на 2.000 тамоў. Сярод атрыманай літаратуры шмат твораў совецкіх пісьменнікаў, рускіх і замежных класікаў. Многа навуковых работ па розных галінах навукі атрымала бібліятэка ў пачатку навучальнага года. Сярод іх асаблівую цікавасць прадстаўляюць навуковыя працы С. Г. Шаумяна «Літаратурна - крытычныя артыкулы», Д. І. Шчэрбакова «Новыя праблемы совецкай геалогіі», У. Хілтона «Аэродынаміка вялікіх хуткасцей», Я. І. Фрэнкеля «Прынцыпы тэорыі атамных ядзер», «Нарысы гісторыі СССР» пад рэдакцыяй Н. М. Дружыніна і інш.

Кніжны фонд мастацкай літаратуры папоўніўся творамі М. Ламаносава, І. Тургенева, атрыманы раман Д. Ярэміна «Крэмлёўскае ўзвышша», вершы П. Жэлезнова «Песні аб маладосці», раман Г. Гор «Юнак з далёкай ракі», аповесць В. Левідавай «Першае каханне», аповесць Я. Коласа «На ростанях» і шмат іншых твораў.

Пры бібліятэцы ў апошні час пачаў упершыню працаваць даведачна-бібліяграфічны аддзел. Толькі за апошні час ён аказаў паслугі ў выбары літаратуры многім сотням студэнтаў. Каштоўныя парады атрымалі ў гэтым аддзеле студэнты для выбару патрэбнай літаратуры, навучыліся карыстацца картацекай.

**Р. ЛЮБІНА,**
**заг. бібліятэкі.**

## Зноў у родным універсітэце

З хваляваннем падыходзіла Галіна Гіль першага верасня да універсітэцкага гарадка. Якім знаёмым і дарагім здавалася ўсё навокал: і клумбы пышна разросшыхся кветак, і ветлівы цяністы скверык, на густую зеляніну якога ўжо паспела легчы залатая фарба восені, і вясёлы бадзёры смех, і звонкія галасы моладзі, што гуляе ля універсітэта.

Разам з гэтым знаёмым прыемным пачуццём дзяўчыну ахапіла нешта вялікае, незнаёмае, хвалюючае. Яна паднялася на трэці паверх і павольна пайшла па шырокаму, залітаму сонечным светам калідору: ...шэсцьдзесят другая, шэсцьдзесят трэцяя, а вось, нарэшце, і шэсцьдзесят чацвертая аудыторыя. Галіна падыйшла да вакна. Стрэлка насценнага гадзінніка скачком прасунулася ўперад і спынілася: тры мінуты аддзяляла яе ад дзесяці. На памяць дзяўчыне сталі прыходзіць дарагія сэрцу успаміны: урокі ў школе ў час студэнцкай практыкі, задушэўныя гутаркі з вучнямі пасля заняткаў... З якой любоўю і цеплынёй думала пра іх Галіна. І вось мара збылася: прагучэў званок, які абвясціў маладую выкладчыцу аб пачатку яе першых самастойных заняткаў.

...Хутка ляцяць мінуты. Упэўнена, спакойна і чотка дыктуе Галіна Уладзіміраўна неабходныя для заняткаў фармуліроўкі. Удумлівыя вочы глядзяць на студэнтаў і як бы пытаюць: «Ці зразумела?».

Маладая выкладчыца Галіна Уладзіміраўна— выхаванка нашага універсітэта. Паўсядзённыя вучэбныя заняткі на працягу пяці год яна ўмела спалучала з грамадскай работай. Яе дыпломная работа з'ўляецца лепшай сярод работ гэтага выпуска. Навуковы кіраўнік Гіль—прафесар Мышкіс адзначыў, што глыбокі змест даследавання «Аб адным ураўнанні пагранічнага пласта» дае поўную магчымасць апублікаваць яго ў навуковым друку.

Зараз у маладога выкладчыка вялікія планы: яна жадае спалучаць вучэбныя заняткі з далейшай навуковай работай.

Здольная, валявая, энергічная Галіна Гіль справіцца з гэтай задачай.

**Г. МАРУНОВА.**

## *ПЕРШАЯ ПЕРАМОГА*

Віктар сядзеў на скамейцы ў старым гарадскім парку, што знаходзіўся на ўзбочыне горада, каля невялікай ціхай рачулкі. Гарадскі шум не даходзіў сюды, ён не перашкаджаў лавіць ап'яняючы водыр вясны, думаць аб сваім жыцці. Была найпрыгажэйшая пара года—вясна. Яркія прамені сонца лагодна лашчылі твар Віктару. З рэчкі несліся вясёлыя і прыгожыя пераклікі птушак, чуліся надакучлівыя кваканні лягушак. Віктар лавіў прыемныя пахі вясны, песні птушак, яны бадзёрылі цела, але на сэрцы было нялёгка. Чорныя і страшныя думкі бралі сваё. «Надумаці толькі—у 10 год застацца без зроку. Што рабіць?... Усе шляхі ў далейшае жыццё адрэзаны. Запаветная мара—стаць гісторыкам—можа не збыцца...»

У яго памяці прамільгнулі падзеі апошніх дзён, гады яго жыцця.

...1945 год. Толькі што совецкія войскі вызвалілі тэрыторыю ад гітлераўскіх захопнікаў. На лясах, палях, дарогах ляжаць горы рознай трафейнай зброі: тут і вінтоўкі, і гарматы, і снарады, і міны, і круглыя рэпаныя гранаты-лімонкі. Віктар і яго маці дапамагаюць совецкім воінам збіраць зброю. І вось аднойчы ён узяў у рукі міну, якая на яго меркаванню была незараджанай, і пацягнуў шнурок капсуля. Раздалося лёгкае шыпенне, а потым страшэнны ўзрыў. Добра, што блізка быў калодзеж і Віктар своечасова кінуў туды неразарваўшуюся яшчэ міну, а то, бадай, зусім-бы загінуў. Хваляй ад разрыву Віктара збіла з ног. Непрытомнага, акрываўленага яго завезлі ў вайсковы шпіталь, але выратаваць зрок не ўдалося...

Восенню гэтага-ж года Віктар Манько пайшоў у першы клас школы сляпых. Шэсць год правучыўся ён там, але сёмы клас распаўся, і вось ён адзін сядзіць у парку і думае. «Самае дарагое і неабходнае—зрок—згублен. Без яго жыць вельмі цяжка: не можаш сам нікуды прайсці без праваднікa, не можаш пачытаць газету, убачыць акаляючае...»

Але не раз Віктар успамінаў Нікалая Астроўскага, які быў яшчэ ў больш цяжкім становішчы. «Ён-жа змог працягваць барацьбу, змог знайсці сваё месца ў жыцці, зрабіць больш, чым некаторыя са зрокам»,—заўсёды рашаў Віктар. Дык чаму і—комсамолец, малады чалавек сваёй Айчыны, не даб'юся свайго? Няхай гэта будзе цяжка, але я павінен дабіцца здзяйснення сваёй мары, я павінен стаць сапраўдным гісторыкам—цвёрда рашыў Віктар і пачаў ажыццяўленне сваёй мары.

У 1951 годзе жыхары раённага цэнтра Хойнікі сталі прыкмячаць сярэдняга ўзросту сляпога хлопца, які з кніжкамі і сшыткамі пад мышкай, трымаючы ў руках палачку, подруч з якім-небудзь вучнем або сам, намацваючы палачкай тратуар, кожную раніцу ішоў у Хойніцкую беларускую сярэднюю школу. Хутка многія жыхары сталі ведаць, што гэта Віктар Манько—сын начальніка раённага аддзялення міліцыі. Цвёрдае жаданне закончыць дзесяцігодку адолела яго.

Цяжкасці, якія сустракаліся ў сярэдняй школе, не спалохалі Віктара. Разам з лепшымі сваімі сябрамі Яўгенам Сапуном, Георгам Камком і выхаванцамі Хойніцкага спецдзетдома ён стаў авалодваць асновамі навук. У яго цяжкай і ўпорнай рабоце многа дапамаглі і другія комсамольцы школы.

...Была раніца таго прыгожага летняга дня, які запамінаецца звычайна на ўсё жыццё. Да Віктара куляй уляцеў у хату яго сябра—Яўген Сапун.

— Віктар, табе зацверджаны залаты медаль!—выпаліў ён.

Перамога! Вялікая і першая перамога. Так ён здолеў перамагчы свой фізічны недахоп і атрымаць вышэйшую ўзнагароду за сканчэнне сярэдняй школы — залаты медаль.

— Ну, а цяпер куды ты жадаеш ехаць працягваць вучобу?—запытаў у Віктара бацька.

— Універсітэт, толькі універсітэт — месца маёй далейшай вучобы,—цвёрда сказаў Віктар.

— Можа цяжка табе будзе там жыць, ты-ж адзін, чужы для ўсіх,—ціха вымавіла маці.

— Зжывемся як-небудзь; студэнты— людзі добрыя,—такім быў адказ на словы маці.

Хутка пасля гэтай размовы Віктар ужо пад'язджаў да Мінска, да горада, аб якім шмат думаў, марыў.

Пасля гутаркі з рэктарам універсітэта Віктар быў вясёлы, жартаўлівы. Так, як ён уяўляў дома, адбылося на самай справе. Яго залічылі студэнтам першага курса гістарычнага факультэта.

Студэнцкая сям'я—бадзёрая, жыццерадасная, дружная прыняла Віктара ў свой калектыў.

Віктар Манько пасяліўся ў кватэры № 5 у інтэрнаце універсітэта па вуліцы Няміга разам са студэнтамі свайго факультэта. З першых дзён ён актыўна ўключыўся ў работу. Па ініцыятыве комсамольскай арганізацыі факультэта на дапамогу Віктару прыйшлі студэнты і студэнткі. Цяпер, праходзячы міма пакоя № 5, можна чуць, як разам з Віктарам займаюцца студэнты. Яны чытаюць яму канспекты, патрэбную літаратуру.

— Вучыцца буду толькі на выдатна— цвёрда гаворыць Віктар.

Яго словам можна верыць.

Віктар Манько стане сапраўдным гісторыкам. Парукай гэтаму—яго ўпартасць, настойлівасць і жаданне.

**Барыс САЧАНКА.**
**студэнт I курса філалагічнага факультэта.**

